политика служила интересам обеспечения мира и стабильности и содействовала реализации экономических интересов Китая. Так, в Пекине прилагают усилия к тому, чтобы стране обеспечивался стабильный рынок сбыта китайской готовой продукции, сырья и продовольственных товаров и приток внешних финансовых поступлений в экономику.

Определенный оптимизм у исследователей вызывают тенденции развития американо-китайских отношений, в которых в последнее время стал прослеживаться поиск общих подходов к отношениям в отдаленной перспективе, нахождения компромиссов, поддержания благоприятной атмосферы во взаимоотношениях, осуществление символических жестов в этих целях. Все это создает предпосылки для влияния Китая на внешнюю политику США.

Учитывая прагматизм Китая, его непримиримость к политике силы и двойных стандартов, а также, принимая во внимание дружественные отношения между Республикой Беларусь и КНР, можно констатировать, что укрепление отношений между нашими странами будет служить ослаблению периодически возникающих предвзятых походов к Беларуси со стороны Запада по различным аспектам внешней и внутренней политики нашего государства.

## АБ БЕЛАРУСКАЙ ШКОЛЕ МІЖНАРОДНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

*Снапкоўскі У. Е., Беларускі дзяржаўны універсітэт*

Фарміраванне нацыянальнай беларускай школы міжнародных даследаванняў пачалося пасля абвяшчэння незалежнасці Беларусі ў 1991 г. і адбывалася разам з працэсам станаўлення знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь. Можна сказаць, што аб’ектыўны працэс знешнепалітычнай актыўнасці беларускай дзяржавы развіваўся паралельна і ўзаемасвязана з суб’ектыўным аблюстраваннем гэтай рэчаіснасці ў знешнепалітычнай думцы.

Сувязь суб’екта і аб’екта даследавання ў выглядзе міжнародных адносін праяўлялася і ў савецкія часы. Праўда, тады суб’ект і аб’ект у выглядзе знешнепалітычнай дзейнасці Беларускай ССР называліся па-іншаму і па сваёй сутнасці мелі зусім іншую якасць. У савецкі час не існавала незалежнай беларускай дзяржавы, а значыць не было і незалежнай знешняй палітыкі БССР; такога паняцця, дарэчы, не існавала і ў палітычнай і навуковай тэрміналогіі. У савецкія часы не склалася і беларуская школа міжнародных даследаванняў як самастойны кірунак навуковых ведаў у БССР, хаця пэўныя перадумовы (арганізацыйныя, кадравыя і тэматычныя) для яе фарміравання і развіцця былі створаныя. У прыватнасці, даволі плённа развіваліся даследаванні выбраных аспектаў гісторыі міжнародных адносін у Еўропе XIX–XX ст. і знешняй палітыкі Германіі. Таксама вывучэнне ў рэспубліцы знешнепалітычнай дзей-

насці і міжнародных кантактаў БССР пасля 1944 г., як і агульных пытанняў знешнепалітычнай дзейнасці саюзных рэспублік, знаходзілася па навуковаму ўзроўню на адным з самых высокіх месцаў у СССР, уступаючы толькі дасягненням украінскіх гісторыкаў і правазаўцаў-міжнароднікаў.

Важнай перадумовай фарміраванне нацыянальнай беларускай школы міжнародных даследаванняў трэба лічыць пачатак знешнепалітычных дыскусій у беларускіх грамадска-палітычных колах, якія разгарнуліся ў час перабудовы. На арэну палітычнага жыцця выйшлі новыя грамадскія і палітычныя сілы, перш за ўсё Беларускі народны фронт, якія ў сваіх праграмных установах і палітычнай дзейнасці вылучалі патрабаванні рэальнага, а не ўяўнага суверэнітэту рэспублікі ў міжнародных адносінах, рэалізацыі канстытуцыйных паўнамоцтваў БССР у знешнепалітычнай сферы. Яны знайшлі ўвасабленне ў Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай ССР, прынятай Вярхоўным Саветам 27 ліпеня 1990 г. Міжнародная праблематыка актыўна абмяркоўвалася на старонках друку і навуковых выданняў, гучала з вуснаў дэпутатаў, дыпламатаў, урадавых чыноўнікаў, публіцыстаў, журналістаў, і зразумела, вучоных.

Пасля абвяшчэння незалежнасці Беларусі само жыццё патрабавала хуткіх і шырокамаштабных мерапрыемстваў для падрыхтоўкі беларускіх дыпламатаў і навуковых рэкамендацый для правядзення знешняй палітыкі новай незалежнай дзяржавы. З гэтай мэтай у 1992 г. было адкрыта Аддзяленне міжнародных адносін БДУ, пераўтваранае ў 1995 г. у Факультэт міжнародных адносін, які стаў цэнтрам міжнародных даследаванняў у краіне. На працягу 1990-х гг. у Беларусі была створана ўся інфраструктура для падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшай адукацыі і навукова-педагагічных работнікаў у галіне міжнародных даследаванняў. Адкрыўся навуковы савет па абароне дысертацый на суісканне вучонай ступені кандыдата і доктара гістарычных навук па спецыяльнасці «Гісторыя міжнародных адносін і знешняй палітыкі», стаў выдавацца часопіс па міжнародных адносінах і міжнародным праве, стварыліся кафедры і падраздзяленні па міжнароднай тэматыцы ў ВНУ і навуковых установах, і таксама недзяржаўныя даследчыя цэнтры, стала выдавацца вучэбная і навуковая літаратура аб міжнародных адносінах.

Фарміраваліся новыя і адначасова развіваліся традыцыйныя кірункі навуковых даследаванняў у галіне міжнародных адносін, узніклі новыя навуковыя дысцыпліны, якія сталі выкладацца ў вышэйшай школе («Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі», «Гісторыя дыпламатычнай службы Беларусі», «Знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь», комплекс рэгіянальназнаўчых дысцыплін, і не толькі еўрапейскіх). Знешнепалітычная тэматыка, прадстаўленая вышэйшым узроўнем дактароў навук, развіваецца ў абласных цэнтрах краіны (Брэсце, Віцебску, Гомеле). Кандыдаты гістарычных навук у галіне міжнародных адносін працуюць ва ўсіх абласных цэнтрах. Сёння ў гэтай галіне ў Беларусі прафісійна задзейнічаны больш чым 10 дактароў гістарычных, палітычных і юрыдычных навук, некалькі дзясяткоў кандыдатаў навук і не толькі па вышэйазначаных галінах ведаў. Свой уклад у развіццё знешнепалітчных даследаванняў, навуковую па-

пулярызацыю і прапаганду знешнепалітычных ведаў уносяць спецыялісты без навуковых ступеняў, дыпламаты, дзяржаўныя служачыя, дэпутаты, палітычныя і грамадскія дзеячы, выкладчыкі, аспіранты, настаўнікі, студэнты.

Назвай і зместам гэтай публікацыі хацеў бы ўзяць на сябе смеласць для сцвярджэння, што пасля 15 гадоў існавання незалежнай Беларусі ў краіне склалася ўласная беларуская школа міжнародных даследаванняў. Пра яе асаблівасці, дасягненні і недахопы, спецыфіку метадалагічнага дыскурсу і канцэптуальныя падыходы, галоўныя тэматычныя кірункі даследаванняў трэба сказаць асобна, што прынамсі аўтарам і іншымі даследчыкамі, і не толькі беларускімі, ужо рабілася (гл. перш за ўсё працы А. Гурына, У. Улаховіча, польскага гісторыка Ю. Вініцкага, нямецкага даследчыка Р. Ліндера).

Беларуская знешнепалітычная думка, якая мела свае навуковыя і нават парадыгмальныя традыцыі ў часы БНР і раннесавецкі перыяд 1920-х гг., атрымала магчымасці сваёй легітымацыі, навуковага і грамадскага прызнання, арганізацыйнага развіцця пры дзяржаўнай падтрымцы толькі ў незалежнай краіне – Рэспубліцы Беларусь.

## А. А. ГРОМЫКО КАК ДИПЛОМАТ И ПОЛИТИК

*Сословская Е. Л., Белорусский государственный экономический университет*

В первой половине 30-х г. во внешней политике Советского Союза еще преобладала здравая линия, которую в военном и политическом руководстве страны представляли Н. И. Бухарин, М. М. Литвинов, М. Н. Тухачевский, И. П. Уборевич. Их заслуга – появление плана создания системы коллективной безопасности, результатами которого стало вступление СССР в Лигу Наций, заключение договоров о взаимопомощи, ненападении с рядом стран. Однако со временем внешнеполитический курс советского государства изменился коренным образом. Сближение, а затем и сотрудничество с гитлеровской Германией, конфронтация с традиционными союзниками России – Англией и Францией – те некоторые шаги, которые обусловили глухую политическую изоляцию, в которой оказалась страна к июню 1941 г.

В начале Второй мировой войны А. А. Громыко работал советником в советском посольстве в США, затем он сменил М. М. Литвинова на посту посла Советского Союза. Пробыв в Вашингтоне 8 лет, в августе 1948 г. А. А. Громыко возвращается в Москву. В 1957 г. Н. С. Хрущев назначает его министром иностранных дел.

Как бы не складывалась международная ситуация, Андрей Андреевич старался проводить твердую линию на нормализацию отношений с США, другими странами Запада, был сторонником политики ограничения и сокращения вооружений, разрядки и мирного сосуществования. Он считал,